● ЭКАЛОГІЯ

# З ЛЮБОЎЮ ДА ПРЫРОДЫ

***1995 год праходзіў пад эгідай года аховы прыроды. І на яго завяршэнні супрацоўнікі раённай бібліятэкі ў п. Міханавічы наладзілі ў сябе тэматычны вечар.***

На яго былі запрошаны настаўнікі Міханавіцкай і Бардзілаўскай школ, мясцовага дзіцячага сада і іншыя жадаючыя. Прысутным была прапанавана па тэме лекцыя, якую прачытала метадыст са станцыі юннатаў Ірына Аляксандраўна Тычына. Аб тым, як вядзецца экалагічнае выхаванне школьнікаў у Міханавіцкай СШ, расказаў настаўнік Л. Ф. Брыцікаў, у Бардзілаўскай НСШ — С. Ф. Пруднікава. Падзялілася вопытам работы з малышамі па выхаванню ў іх любві да ўсяго навакольнага З. І. Чарняўская з дзіцячага сада «Каласок».

У бібліятэцы былі аформлены цікавыя тэматычныя выставы, быў арганізаваны адкрыты прагляд адпаведных кніг. І не выпадкова ўвага ўсіх педагогаў была звернута да Кацярыны Дзмітрыеўны Ларыёнавай, якая аж 40 гадоў адпрацавала ў сельскай бібліятэцы. А зараз, нават пайшоўшы на пенсію, працягвае работу ў аддзеле камплектавання нашай бібліятэкі. Гэта было прыемна і нашай ветэранцы, і нам. Бо, калі шчыра, такога прызнання звычайнаму сельскаму бібліятэкару ці дачакаешся ў наш час?

● ЮБІЛЕІ

# ПАВІНШАВАЛІ КАЛЕГУ

***У канцы лістапада мне пашчасціла быць сведкай, як культработнікі Чурылавіцкага СДК урачыста віншавалі з 45-годдзем загадчыцу бібліятэкі Фаіну Рыгораўну Давальцову.***

Яны аформілі віншавальную папку, куды былі занесены вершаваныя радкі з самымі цёплымі пажаданнямі. Потым Фаіна Рыгораўна ўсіх запрасіла за стол, накрыты ў яе доме. Гэты дзень нараджэння нагадваў мне нейкі творчы вечар, дзе было месца і добрай песні, і трапнаму жарту, і добразычліваму тосту.

І мне падумалася, што сапраўды гэты чалавек заслужыў такой увагі. Мяркуйце самі: Ф. І. Давальцова 23 гады працуе на адным месцы. Да яе цягнуцца аднолькава як дарослыя, так і дзеці. З малышамі яна арганізавала лялечны тэатр і рыхтуе з імі цікавыя прадстаўленні. Акрамя таго, у яе цудоўны голас. І ўвесь час, які тут працуе, самы актыўны ўдзел прымае ў мастацкай самадзейнасці. Фальклорны калектыў Чурылавіцкага СДК, у якім спявае Фаіна Рыгораўна, запрошаны вясной на Міжнародны фестываль фальклору ў Германію.

Неабыякавая да ўсіх жыццёвых перамен, гэта жанчына заўсёды займае актыўную пазіцыю і яе вельмі паважаюць вяскоўцы, інтэлігенцыя і асабліва творчыя людзі, якім яна аддае часцінку сябе.

**Зоя РАТУНОВА,**
**супрацоўніца раённай бібліятэкі.**

Наша жыццё. – 1995. – 9 снежня